## 20 ПУНКТАЎ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ ~~ПЛАТФОРМЫ~~ ПРАГРАМЫ

Мая перадвыбарчая ~~платформа~~ праграма грунтуецца на выбарчай платформе БНФ "Адраджэньне"

Я, БЯЛЯЦКІ АЛЯКСАНДР ВІКТАРАВІЧ, выступаю

І.ЗА:

Вярхоўную волю народа, які праз дэмакратычна абраных дэпутатаў павінен сам вырашаць свой лёс. Нам трэба ўсвядоміць, што ад нас і толькі, залежыць будуч~~ае~~ыня нашых дзяцей, нашай Беларусі.

СУПРАЦЬ:

Манаполіі партыйнай бюракратыі на ўладу і ідэалогію. Мы не павінны дазваляць кіраваць намі праз нашыя галовы.

2. ЗА:

Вывад усіх прадпрыемстваў на тэрыторыі Мінска з-пад саюзнага падпарадкавання.

СУПРАЦЬ:

Каланіяльнай палітыкі, якую праводзіць Цэнтр. Мы шмат ведаем аб прыгнёце краінаў трэцяга свету, не заўважаючы доўгі час, што 90 працэнтаў усяе прамысловасці на нашай зямлі належыць не нам, а саюзным міністэрствам. Мінск атрымлівае толькі І прац. халадзільнікаў, 3 прац. тэлевізараў, І,2 прац. веласіпедаў з таго, што вырабляецца ў горадзе.

3. ЗА:

Існаванне розных формаў уласнасці -- калектыўнай, дзяржаўнай, прыватнай, каапэратыўнай і інш.

4. ЗА:

Перадачу зямлі тым, хто хоча працаваць на ёй.

СУПРАЦЬ:

Эксплуатацыі мінчан на сельскагаспадарчых працах для падтрымання нерэнтабельных калгасаў і саўгасаў.

5. ЗА5

Перадачу ўсіх ільготных медыцынскіх установаў і спецустановаў дзецям і старым.

СУПРАЦЬ:

Сацыяльных прывілеяў для партыйна-бюракратычных функцыянераў і іхніх сем'яў.

6. ЗА:

Скарачэнне зарплаты наменклатуры і павышэнне пенсій і стыпендый.

7. ЗА:

Устанаўленне кантролю над бюджэтам грамадскіх арганізацыяў у горадзе, у першую чаргу КПСС.

8. ЗА:

Увядзенне афіцыйнага ўзроўню пражытковага мінімуму, з улікам узроўню інфляцыі, у першую чаргу для пенсіянераў, студэнтаў, нізкааплочваемых працоўных.

9. ЗА:

Скіроўванне і заахвочванне прамысловых прадпрыемстваў горада на выпуск тавараў першай неабходнасці.

10. ЗА:

Вынас экалагічна небяспечных прадпрыемстваў за межы горада ці іхняе перапрафіляванне. Пераарыентацыю гаспадаркі горада на экалагічна чыстыя вытворчасці.

СУПРАЦЬ:

Забору артэзіянскай вады прамысловымі прадпрыемствамі ў г.Мінску.

11.ЗА:

Трохгадовы аплочваемы адпачынак для мацярок па догляду за дзецьмі; карэннае паляпшэнне ўмоваў догляду дзяцей у дзіцячых садках і школах /якасць ежы, нарматыўныя плошчы размяшчэння дзяцей, санітарныя ўмовы і інш/.

12. ЗА:

Узмацненне кантролю за якасцю і чысцінёй харчоў і пітной вады. Вывад сані- ХХХХХХХ тарнай службы горада з ведам~~тваннага~~аснага падпарадкавання.

13. ЗА:

Мінск -- горад дэмакратыі і высокай палітычнай культуры, дзе на справе павінны здзяйсняцца: свабода слова, друку, сходаў і мітынгаў, свабода асацыяцыяў.

14. ЗА:

Рэальныя ўмовы для шматпартыйнасці ў горадзе, утварэнне незалежных прафсаюзаў, якія б на справе баранілі інтарэсы працоўных.

15. ЗА:

Права рэферэндуму для вырашэння жыццёва важных пытанняў для насельніцтва г.Мінска.

16. ЗА:

Прамыя, тайныя, роўныя выбары старшыні гарвыканкому усімі выбаршчыкамі г.Мінска.

17. ЗА:

Аднаўленне культурнай, гістарычнай спадчыны г.Мінска.

18. ЗА:

Найбольш поўнае задаваленне нацыянальных інтарэсаў беларусаў, а таксама прадстаўнікоў усіх народаў, якія жывуць у г.Мінску.

19. ЗА:

Карэнную змену адукацыі ў бок яе гуманізацыі, дэідэалагізацыі і разнастайнасці формаў навучання.

20. ЗА:

Безумоўнае захаванне правоў вернікаў усіх веравызнанняў нашага краю; вызваленне рэлігіі ад любога дыктату ~~зверху~~ дзяржавы; за вяртанне рэлігійным аб'яднанням старых храмаў і пабудову новых, па меркаванні вернікаў, адкрыццё нядзельных школ для навучання рэлігіі, па жаданню бацькоў.

ЗЯМЛЯ І ЗАВОДЫ -- ТЫМ, ХТО НА ІХ ПРАЦУЕ. УЛАДА САВЕТАЎ -- ТЫМ, ХТО АДСТОЙВАЕ ІНТАРЭСЫ НАРОДА.

~~Член~~ Сябра Сойма Беларускага Народнага Фронта "Адраджэньне", дырэктар літаратурнага музея М.Багдановіча, кандыдат у народныя дэпутаты гарадскога Савета г.Мінска па 241 Камуністычнай выбарчай акрузе БЯЛЯЦКІ АЛЯКСАНДР ВІКТАРАВІЧ.